ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (2007) ● Чацвер, 20 лістапада 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● ДЭЛЕГАЦЫЯ З ГДР ● ІДЗЕ АБМЕН КАМСАМОЛЬСКІХ ДАКУМЕНТАЎ ● ПРАФСАЮЗНЫ СХОД ФІЗФАКА ● ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ — ЗАЎСЁДЫ ВЕРНЫЯ! ● ПОДЫХ СЕСІІ ● ПАЧЭСНАЕ СЛОВА «КАМУНІСТ» ● НАВУКОВЫЯ ГУРТКІ ФПМ ● СПОРТ ● КАЛІ ТЫ АЛЬНІНІСТ...

СЁННЯ — ДОБРА, ЗАЎТРА — ЯШЧЭ АЕПШ!

Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка на фізічным факультэце адбыўся справаздачна-выбарны прафсаюзны сход.

У справаздачным дакладзе старшыня прафбюро Э. Е Радоускі прааналізаваў работу калектыву за мінулы год. Асноўную увагу прафбюро удзяляла арганізацыі і правядзенню сацыялістычнага спаборніцтва, у якім удзельнічалі ўсе выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта.

Узятыя сацыялістычныя абавязацельствы былі накіраваны на далейшае удасканаленне вучэбнага працэсу, увядзенне новых метадаў навучання з прымяненнем тэхнічных сродкаў, сістэматычнае абнаўленне навуковага зместу выкладаемых вучэбных дысцыплін, на павышэнне узроўню вучэбна-выхаваўчай і навукова-метадычнай работы кафедр, фарміраванне марксісцка-ленінскага светапогляду і ідэйнай перакананасці студэнтаў.

У 1974 годзе факультэт выконваў 27 навукова-даследчых тэм Дзяржаунага камітэта па навуцы і тэхніцы пры Савеце Міністраў СССР, 52 тэмы па народнагаспадарчаму плану БССР, 6 тэм па праблемах вышэйшай школы і 33 гаспадарча-дагаворныя работы на агульную суму 1400 тыс. рублёў.

Вялікая увага удзялялася вучэбна-метадычнай рабоце — распрацоўцы спецкурсаў, удасканаленню лабараторных работ. У мінулым навучальным годзе распрацавана 58 новых агульных і спецыяльных курсаў, пастаулена 147 новых і удасканалена 81 лабараторная работа.

Праводзілася работа па шырокаму прыцягненню на фізічны факультэт выпускнікоў школ і рабочай моладзі рэспублікі. Быу праведзены «Дзень адкрытых дзвярэй», у час якога факультэт наведала больш 600 чалавек. У Станькаускай школе і школах Дзяржынска рэгулярна праводзяцца заняткі школы юных фізікаў. Усё гэта садзейнічае павышэнню якасці падрыхтоукі высококваліфікаваных спецыялістаў, павышэнню паспяховасці студэнтаў, якая склала за апошні навучальны год 89,8 працэнта. Гэта, канешне, не высокі паказчык, аднак пастаянны рост паспяховасці за апошнія гады дазваляе спадзявацца, што далейшае удасканаленне вучэбнага працэсу, кантроль за самастойнай работай студэнтаў дазволіць факультэту выйсці у лік першых па паспяховасці.

Па выніках спаборніцтва кафедр у мінулым годзе першае месца заняла кафедра пауправаднікоу. Яе дружны малады калектыу дасягнуу вялікіх поспехаў у навуковай, вучэбна-метадычнай і палітыка-выхаваучай рабоце, выканау вялікі аб'ём гаспадарча-дагаворных работ.

Такіх калектыву нямала на факультэце. Унеслі свой уклад у дасягненні фізфака кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ, ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі, электрафізікі, біяфізікі і інш.

У 1974 годзе фізічны факультэт заняу першае месца у сацыялістычным спаборніцтве сярод факультэтаў БДУ. Фізікі не знікаюць тэмпаў і у 1975 годзе. Зараз яны рыхтуюцца падвесці вынікі спаборніцтва апошняга года дзевятай пяцігодкі, паспяхова выконваюць узятыя да XXV з'езда КПСС павышаныя абавязацельствы.

Немалых поспехаў дасягнуу фізічны факультэт. У гэтым значная заслуга прафсаюзпага бюро, якое пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, у кантакце з дэканатам правяло значную работу па мабілізацыі калектыву на выкананне задач, пастауленых партыяй і урадам перад вышэйшай школай.

Работа прафсаюзнага бюро фізфака была разгледжана Мінскім абкомам прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых установ. Прэзідыум абкома адзначыу станоучую работу прафбюро фізфака і узнагародзіу рад членаў прафбюро Ганаровымі граматамі за актыуную работу у прафсаюзнай арганізацыі і рэкамендаваў мясцкомам вышэйшых навучальных установ выкарыстаць вопыт работы прафбюро фізфака у сваёй практычнай дзейнасці.

В. ДРАКО.

На мінулым тыдні ва універсітэце гасціла дэлегацыя нямецкіх студэнтаў з Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера (ГДР). Госці далі канцэрт.

На здымку: цёплы прыём чакаў членаў дэлегацыі у камітэце камсамола БДУ.

Фота **Т. Петрашкевіч.**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

ФПМ

У камсамольскай арганізацыі факультэта поўным ходам ідзе падрыхтоука да абмену камсамольскіх дакументаў. Праводзяцца сходы, правяраецца наяунасць камсамольскіх білетаў. Групы уключыліся у спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС.

***

З 13 лістапада для студэнтаў ФПМ і мехмата пачаў чытаць спецкурс «Алгебраічная тэорыя кадзіравання» прафесар Іенскага універсітэта Лінднер Рольф.

***

Актывізаваў сваю працу штаб «Камсамольскага пражэктара». Ён ужо выпусціу тры нумары «КП», у якіх выкрыу злосных прагульшчыкаў, «хвасцістаў». У апошнім нумары апублікаваны вынікі рэйду па інтэрнацкіх пакоях, дзе жывуць студэнты ФПМ.

Кіруе штабам «КП» студэнт У. Малюгін.

***

Знаёміць першакурснікаў са студэнцкім жыццём можна і так: праз прызму гумару, жартау, вясёлых песень. І старшакурснікі факультэта арганізавалі у мінулую суботу для сваіх малодшых сяброу вечар з выступленнем агітбрыгады ФПМ. У актавую залу прыйшлі усе жадаючыя прыемна правесці свой вольны час.

***

Пяць цікавых, багатых на уражанні дзён правялі у Ленінградзе у Кастрычніцкія святы самадзейныя артысты факультэта.

С. МАКАЕВА.

ХІМФАК

5 лістапада адбылася хвалюючая сустрэча студэнтаў факультэта з былым сакратаром Мінскага падпольнага абкома камсамола Яугенам Мікалаевічам Канапліным. Затаіушы дыханне, слухалі хімікі расказ былога падпольшчыка пра сяброў па барацьбе, пра тое, што ім давялося перажыць. Шмат прыкладау непахіснасці, стойкасці маладых камсамольцаў - падпольшчыкаў прывёу Я. М. Канаплін.

***

«Аблічча сучаснага студэнта - хіміка» — сход пад такой назвай правялі першакурснікі хімфака.

Сакратар камітэта камсамола факультэта А. Скарапанау павіншаваў усіх прысутных са святам — днем нараджэння камсамола. Ён жа расказаў першакурснікам пра факультэт, яго кафедры, пазнаёміу з задачамі, якія стаяць сёння перад хімікамі.

З цёплым словам да студэнтаў звярнулася малодшы навуковы супрацоунік СНДЛ В. Герасімовіч. Яна запрасіла жадаючых улицца у творчы калектыу лабараторыі. Супрацоунік факультэта М. Фрэнкель звярнуу увагу на студэнцкае жыццё, расказау пра факультэцкія традыцыі, святы. Поспеху у вучобе пажадау загадчык кафедры неарганічнай хіміі В. Свірыдаў.

***

Згодна з планам лекторыя, якім загадвае М. Рэзнікаў, выкладчык факультэта, у лістападзе адбудзецца сустрэча студэнтаў з аутарам кнігі «Руіны страляюць ва упор» Іванам Новікавым.

Напярэдадні свята — Дня канстытуцыі — на факультэце пройдзе «Агеньчык». На яго запрошаны І. Вятроў, былы міністр юстыцыі, С. Салдаценка, былы камандзір партызанскага злучэння на Магілёушчыне.

Т. ВОЛКАВА.

Актыўна ідзе абмен камсамольскіх дакументаў на юрфаку.

НА ЗДЫМКАХ: камсамольцы 4-й групы IV курса прымаюць Зварот да усіх студэнтаў БДУ; білеты уручае намеснік сакратара партбюро К. Кічыгіна; чырвоныя кніжачкі у руках А. Зайцава і В. Даброва.

Фота **У. Дораша.**

ЗВАРОТ

КАМСАМОЛЬЦАЎ 4-й АКАДЭМІЧНАЙ ГРУПЫ IV КУРСА ЮРФАКА ДА УСІХ СТУДЭНТАЎ БДУ

Мы, студэнты 4-й групы IV курса юрыдычнага факультэта, з вялікім задавальненнем успрынялі рашэнне красавіцкага (1975 г.) Пленума ЦК КПСС аб скліканні чарговага з'езда партыі. І сёння, абменьваючы камсамольскія дакументы, мы поўныя рашучасці яшчэ лепш вучыцца, прымаць больш актыўны удзел у навуковых даследаваннях, грамадскім жыцці факультэта.

Уключыушыся ў сацыялістычнае спаборніцтва за ганаровае права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС, мы заклікаем усіх юнакоў і дзяучат універсітэта сваёй актыунасцю у грамадскім жыцці, выдатнай вучобай, гатоунасцю да працы і абароны роднай краіны, спартыунымі перамогамі стварыць калектыуны падарунак роднай Камуністычнай партыі, XXV з'езду КПСС.

Рыхтуючы дастойную сустрэчу XXV з'езду КПСС, мы **абавязваемся:**

1. Настойліва авалодваць марксісцка-ленінскім вучэннем, дасягненнямі навукі, тэхнікі і культуры.

2. Здаць зімовую экзаменацыйную сесію 1975—1976 навучальнага года толькі з адзнакамі «добра» і «выдатна».

3. Прыняць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце факультэта пад дэвізам «Кожны камсамолец групы — член СНТ».

4. Арганізаваць чытанне лекцый у групе пад рубрыкай «XXV з'езду КПСС — дастойную сустрэчу».

5. Прачытаць у падшэфных школах Мінска 50 лекцый на прававыя тэмы.

6. Прадоўжыць работу па пошуку былых студэнтаў, выкладчыкаў-юрыстаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху і падполля.

7. Падрыхтаваць для ўдарнага будаўніцтва у зімовым студэнцкім атрадзе 8 чалавек.

8. Падрыхтаваць трох спартсменаў першага разраду і пятнаццаць — другога і трэцяга разрадаў.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ — ЗАЎСЁДЫ ВЕРНЫЯ!

ВУЗЫ ДРУЖБЫ

Доуга будуць памятаць гэты светлы восеньскі дзень юнакі і дзяўчаты з В'етнама, ГДР, Кубы, Польшчы, Чэхаславакіі, Гвінеі, Ірака і іншых краін.

...Два экскурсійныя аутобусы спыніліся каля мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Засмучана звіняць званы. Засяроджаныя твары маладых людзей, якія толькі у гэтым годзе атрымалі студэнцкія білеты БДУ. З хваляваннем слухаюць яны расказ аб трагедыі Хатыні і сотняў іншых вёсак Беларусі.

А ля Кургана Славы адбылося пасвячэнне у студэнты. Замежных рабят павіншаваў з пачаткам вучэбнага года прарэктар універсітэта І. П. Чэпа. Ён пажадаў усім вялікіх поспехаў у вучобе, у авалоданні ведамі па выбранай спецыяльнасці.

— Памiж Савецкім Саюзам і іншымі краінамі, народы якіх пажадалі ісці па шляху сацыялізму, склаліся адносіны шчырай дружбы, — гаворыць стажор з ГДР Райнер Цэрк.

— Як і савецкі народ, мы у гэтым годзе святкавалі 30-годдзе вызвалення ад жахаў фашызму, — гэта ужо словы Іржыны Служовай, студэнткі з Чэхаславакіі. — Усе мы разумеем, што толькі дзякуючы гераічнай Савецкай Арміі свабодна жывём не толькі мы, але і уся Еўропа. Будзем жа верныя памяці герояў, якія аддалі сваё жыццё за наша шчасце.

— Не, гэта ніколі больш не павінна паўтарыцца! — як клятва, гучаць гэтыя словы над свяшчэннай зямлёй подзвігу.

Моцныя вузы дружбы моладзі розных краін свету не дадуць вярнуцца чорнай хмары вайны. Усім народам патрэбен мір.

У. БУДАЙ,
ст. выкладчык кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў, аспірантаў, стажорау.

Фота аутара.

«...МЫ МАРАЮ АБ ШЧАСЦІ ЖЫВЁМ!»

БЫЛА нядзеля. З ранку Ленінскі пакой інтэрната № 7 напоунiуся песнямі, смехам, галасамі нямецкай моладзі. Са святочным настроем прыйшлі сюды юнакі і дзяўчаты. Сто адзінаццаць студэнтаў, стажорау, аспірантаў, што займаюцца у Беларускім дзяржаўным універсітэце і Беларускім політэхнічным інстытуце, сабраліся на свой справаздачна - выбарны сход, каб пагаварыць аб праробленай рабоце, аб вучобе, абмеркаваць новыя задачы на наступны год.

Павестка дня, зачытаная старшынёй сходу Гелмарам Ліберам, прынята аднагалосна. У прэзідыуме выдатнікі вучобы, актывісты, госці сходу.

Са справаздачай выступіу сакратар гарадскога камітэта Саюза свабоднай нямецкай моладзі Уве Берант. Уве адзначыу, што мінулы год быу запоўнены цікавымі падзеямі у жыцці нямецкіх навучэнцау. Выдатнымі поспехамі у вучобе імкнуліся сустрэць маючы адбыцца XXV з'езд КПСС і IX з'езд Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі юнакі і дзяўчаты. Сем груп вялі паміж сабой спаборніцтва за права называцца групай імя Фрыца Шмігеля.

Актыуны удзел члены Саюза свабоднай нямецкай моладзі прымалі у навуковай рабоце. Яны цікава праводзілі свой адпачынак. Галоунай задачай камітэт паставіу удзел усіх юнакоу і дзяўчат у мерапрыемствах, што праводзіліся ў інстытуце і універсітэце. Добра папрацавалі члены будаўнічых брыгад на тэрыторыі Беларусі. Моладзь прыняла удзел у барацьбе за вызваленне Луіса Карвалана. І яшчэ шмат карысных спраў было названа у выступленні сакратара.

Слова мае адказны за вучобу нямецкіх студэнтау у горадзе Мінску Ганс Хагенер. За выдатныя поспехі у вучобе, добрую грамадскую працу чатыры члены Саюза свабоднай нямецкай моладзі атрымалі медаль Леніна. Сярод іх — Райнер Цэрк, Франц Іленбург, Манфрэд Герцыміх і Карын Руле. За актыуны удзел у грамадскім жыцці, спартыунай рабоце, за арганізацыю групы палітычнай песні, добрасумленную працу на уборцы бульбы многія члены Саюза свабоднай нямецкай моладзі атрымалі каштоуныя падарункі.

Выдатнік вучобы Манфрэд Герцыміх паznаёміу прысутных з планам работы на 1975—1976 гады. «Кожны з нас, — сказау ён, — павінен лічыць сваім абавязкам па усіх прадметах у залікоуцы мець толькі «5».

Ганс Хагенер закрануу у сваім выступленні пытанне аб карысці усіх мерапрыемстваў, што былі праведзены і якія патрэбна яшчэ правесці у будучым годзе.

З прывітальным словам звярнуўся да удзельнікаў сходу адказны сакратар Мінскага гарсавета па справах замежных навучэнцау Аугусцін Казіміравіч Юзафовіч. Ён адзначыу, што колькасць нямецкіх студэнтау у беларускай сталіцы з кожным годам павялічваецца. І таму яны павінны больш актыуна удзельнічаць у грамадскай рабоце.

Член рэдакцыйнай камісіі Ула Вагнер унесла дапауненні да зачытанага плана. На гэты раз неабходна выбраць 8 членау камітэта. Юнакі і дзяўчаты выступілі з прапановамі, даючы кароткую характарыстыку кожнаму таварышу.

І вось за восем лепшых усе удзельнікі сходу паднялі рукі.

Пакуль члены новага камітэта размяркоувалі абавязкі, ансамбль палітычнай песні Беларускага політэхнічнага інстытута выканау некалькі патрыятычных песень.

Надышлі самыя хвалюючыя хвіліны... Адзін з членау новага камітэта аб'явіу, што сакратаром яны зноў выбралі Уве Беранта.

Сход закончыуся. Матыу «Гімна дэмакратычнай моладзі» запоўніу Ленінскі пакой. Студэнты пелі пра сваю мару. Яна — аб міры ва усім свеце.

А. ЯНЧЭЎСКАЯ,
студэнтка журфака.

УСЯГО САМАГА НАЙАЕПШАГА

ІНТЭРВ'Ю НУМАРА

Гэты чалавек падабаецца адразу. Нічым не прыкметны на першы погляд твар расцвітае ззянiем блакітных уважлівых вачэй. Таварышы ведаюць яе рознаю: то чулаю і строгаю, то прынцыповаю і дзелавою. І наогул гэта прыемная, вясёлая і рухавая дзяўчына.

Знаёмцеся: мая субяседніца — Зузана Бернер, член дэлегацыі нямецкіх студэнтау, сакратар камсамольскага бюро Саюза свабоднай нямецкай моладзі філасофскага факультэта Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера.

— Нашу рэспубліку Вы наведалі, мабыць, упершыню?

— Так, у Беларусі я упершыню, а у Савецкім Саюзе ўжо была тры разы. Наведала Маскву, Кіеу, Ленінград, Караганду. А вось выпадак пабываць у Беларусі прадставіуся проста нечакана. Ехала дэлегацыя ансамбля нашага універсітэта, і я, вядома, таксама не адмовілася ад гэтай цікавай паездкі.

— Скажыце, калі ласка, якая галоуная мэта прыезду дэлегацыі Іенскага універсітэта у нашу навучальную установу?

— Галоуная задача — гэта супрацоуніцтва філасофскага факультэта нашага універсітэта з філасофскім аддзяленнем гістарычнага факультэта БДУ. Мяркуем разам вырашаць складаныя праблемы, абменьвацца вопытам, сумесна шукаць новыя, больш дасканалыя формы навуковай работы. На філасофскім аддзяленні вашага універсітэта ёсць многа цікавых традыцый, якія мы з задавальненнем выкарыстаем у нашай рабоце.

— Зузана, Вы шмат дзе пабывалі за час знаходжання у нашай рэспубліцы. Вашы уражанні?

— Усе разам мы наведалі тэатр оперы і балета, дзе паглядзелі святочны канцэрт. Пабывалі у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Доме-музеі І з'езда РСДРП, у філармоніі. Вельмі спадабалася на ВДНГ. Незабыуным застанецца наведанне Кургана Славы і Хатыні.

У мінулым годзе я закончыла універсітэт, цяпер працую над дысертацыяй. Дома немагчыма дастаць некаторыя кнігі, якія мне вельмі патрэбны. Таму, нядрэнна валодаючы рускай мовай, я чытаю іх у бібліятэцы вашага універсітэта.

Дзе б мы ні пабывалі, заусёды адчувалі цёплыя, добразычлівыя адносіны да нас беларускіх людзей, пераконвалiся у іх добрых, сардэчных пачуццях. Уражанняу пасля наведання вашай рэспублікі вельмі многа. І усе яны надоуга застануцца у памяці.

— Але, напэўна, штосьці адно з паездкі па нашай рэспубліцы больш за усё ўразіла Вас, глыбока запала у душу...

— Зусім нядауна мы наведалі Хатынь. Нікога не пакінуу абыякавым усхваляваны расказ адной маці, на вачах якой адбываліся зверствы фашызму. Для нас, немцаў, гэта мела асаблівы сэнс. Гора беларускіх людзей адбівалася гукамі званоу у нашых сэрцах. У гэты момант мы адчулі духоунае адзінства з вашым народам і у душы паклялiся прыкласці усе намаганні, каб на зямлі заусёды быу мір.

— Што б Вы, Зузана, хацелі пажадаць студэнтам нашага універсітэта?

— Перш за усё я жадаю усім студэнтам добрых поспехаў у вучобе, здароуя, шчасця. І абавязкова пасля заканчэння універсітэта стаць добрымі спецыялістамі. Усяго ім самага найлепшага!

І. АБРАМОВІЧ.
студэнтка II курса журфака.

ПАЗЫЎНЫЯ СЕСІІ

ЯГО ВЯЛІКАСЦЬ—ЗАЛІК

Субота — любімы студэнцкі дзень. І як у любую суботу, пасля заняткаў у галоўным корпусе стоупатварэнне каля гардэроба, вясёлы шматгалосы гул, прыўзняты настрой і... адсутнасць чаргі каля латка з пражкамі.

Корпус хутка пусцее. Аднак каля 507-й аудыторыі мнагалюдна, чутны стрыманы шэпт, гартанне канспектаў. У 15 гадзін пачынаецца залік па гісторыі заходніх і паўднёвых славян у студэнтаў 4-й групы IV курса гістфака.

Падыходжу да рабят і задаю зусім не прафесіянае, але, як своеасаблівы студэнцкі пароль, пытанне: «Як экзаменатар, нічога?».

— Во!—у адказ сімвалічна падымаюць уверх вялікі палец.

Роўна у 15 гадзін заходзіць першая пяцёрка смельчакоў: М. Няхайчык, У. Паклонскі, І. Сівая, В. Андруховіч, М. Гарбачоу.

Зручная хвіліна, каб пагаварыць са старастай групы, камсоргам Валерыем Мацэлем:

— Сярод тых, хто ўваишоу, як заведзена, павінны быць моцныя, упэўненыя у сваіх ведах студэнты. У вас, увогуле, многа выдатнікаў?

— Выдатнік — крыху не тое слова. У групе ёсць студэнты, якія займаюцца амаль на «выдатна»: М. Няхайчык, Г. Петрыкава, М. Ляпешка.

Пятнаццаць хвілін праходзяць непрыкметна. Трымаючы у руках залікоуку, з аудыторыі выходзіць М. Няхайчык.

— Ну як, — акружаюць яго сябры,—здау?

— Залік, — канстатуе Мікалаи і дадае: — Я не усё вывучыу, але пытанне папалася пра Бамарскае царства у VII—X стагоддзях. Я яго ведау.

Ну што ж! Як кажуць, важны не метад, важны вынік. Хаця... хаця хто не ведае, як «не вучаць» выдатнікі і «амаль выдатнікі».

У выкладчыцы Л. П. Сушкевіч, якая праводзіць залік, прашу дазволу папрысутнічаць у аудыторыі. І адразу ж пападаю у спакойную добразычлівую атмасферу кантакту выкладчыка са студэнтам, ненапружаны, але працоуны, дзелавы тэмп, у якім ідзе залік. Пытанне— адказ—новае пытанне.

Адзін за адным, атрымаушы залік, пакідаюць аудыторыю прадстаўнікі першай пяцёркі. Упэўненасцю і трываласцю звяртаюць на сябе увагу адказы М. Гарбачова, М. Ляпешкі, камсорга В. Мацэля (дарэчы, ён—круглы выдатнік).

— Увогуле, рабяты паказалі добрыя веды, — кажа Людміла Пятроуна, ставячы чарговы залік (уладальніцай залікоукі аказалася Т. Сулім), — толькі дзяучаты хвалююцца больш за хлопцаў.

І вось радзее ля дзвярэй чарга, выходзяць апошнія студэнты, у калідорах пасяляецца гулкая суботняя цішыня.

Яго вялікасць Залік здадзены!

Л. СЯЛІЦКАЯ,
студэнтка II курса журфака.

Лекцыю па фізічнай геаграфіі Польшчы для студэнтаў III курса геафака чытае дацэнт М. В. Лаурыновіч.
Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.

ДАЛУЧЭННЕ ДА НАВУКІ

Ва умовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі даследчая работа студэнтаў ператварылася з дапаунення да вучэбнага працэсу у яго неабходны элемент, у адзін з важнейшых сродкаў павышэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Гэта новая роля навукова-даследчай работы студэнтаў (НДРС) была асабліва яскрава падкрэслена у прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева на Усесаюзнам злёце студэнтаў, у пастанове ЦК партыі і Савецкага урада «Аб мерах па далейшаму удасканаленню вышэйшай адукацыі у краіне» і іншых дакументах.

На малодшых курсах, калі выкладаюцца у асноуным агульнаадукацыйныя дысцыпліны, да навуковых даследаванняу студэнты прыцягваюцца праз навуковыя гурткі. Улічваючы гэта, створаны у красавіку 1975 года савет па НДРС факультэта прыкладной матэматыкі вырашыу расшырыць сетку навуковых гурткоу для студэнтаў малодшых курсаў, таму што іменна праз навуковыя гурткі можна прывіць любоу да навуковых даследаванняу і у далейшым арыентаваць студэнтау на выбар той ці іншай спецыялізацыі (матэматычнае забеспячэнне АСК, матэматычнае забеспячэнне ЭВМ, прымяненне сродкаў вылічальнай тэхнікі).

Калі у мінулым навучальным годзе на факультэце працавала пяць навуковых гурткоў, то у гэтым — ужо дзевяць і тры семінары для студэнтаў, якія працуюць у СНДЛ і СВЦ: гурток па фундаментальнай матэматыцы, «Праграміст», «Сучаснае праграміраванне», «Аўтаматычная апрацоука даных», «Праектаванне матэматычнага забеспячэння задач мадэліравання», «Даследаванне аперацый», «Сістэмнае праграміраванне», «Метады аптымізацыі», «Тэорыя верагоднасцей і матэматычнай статыстыкі».

Неабходна адзначыць вялікую арганізацыйную работу савета СНТ ФПМ па прыцягненню студэнтаў у навуковыя гурткі.

Зараз факультэт рыхтуецца да правядзення алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». І работа студэнтаў малодшых курсаў у навуковых гуртках будзе, бясспрэчна, садзейнічаць больш актыунаму удзелу студэнтаў у праводзімай алімпіядзе, дапаможа ім заняць прызавыя месцы.

А. САМУСЕНКА,
намеснік старшыні савета па НДРС ФПМ.

У ВНУ КРАІНЫ

БЮРО ПЕРАКЛАДАЎ

З мэтай паляпшэння парадку перакладаў навукова-тэхнічнай літаратуры з замежных моу на рускую мову у Адэскім інжынерна-будаунічым інстытуце створана студэнцкае бюро перакладау і зацверджана палажэнне аб гэтым бюро.

У састаў бюро уваходзяць выкладчыкі кафедры замежных моу, а таксама лепшыя студэнты і аспіранты.

Па заяуках кафедр і лабараторый СБП выконвае работу па перакладу анатацый і рэферыраванню навукова-тэхнічнай літаратуры па будаунічых спецыяльнасцях, выдаваемай на англійскай, нямецкай і французскай мовах.

(«Кадры стройкам», Адэса).

Занятні па англійскай мове са студэнтамі I курса аддзялення філасофіі гістфака праводзіць С. А. Карасцялёва.
Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.

Шмат добрых спраў на рахунку камітэта камсамола філфака, актыўна удзельнічае ён у факультэцкім жыцці: арганізоувае «працоуныя дэсанты», тэматычныя палітінфармацыі, вечары.

Нядаўна камітэтам камсамола была праведзена агульнапалітычная атэстацыя, якая паказала узросшы ідэйна-палітычны узровень камсамольцаў, мабілізавала іх ініцыятыву. З вялікім уздымам дзейнічала 16 лістапада група «працоўнага дэсанта ў новым кінатэатры. Зараз у камітэце абмяркоуваюцца пытанні конкурснай тэматычнай палітінфармацыі «Саюз непарушны рэспублік свабодных». Рыхтуецца урок мужнасці, які будзе праходзіць у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

На здымках: ідзе пасяджанне камітэта камсамола філфака. Выступае з прапановай сакратар камітэта камсамола **М. Ццянкоу.**

Фота **Т. Петрашкевіч.**

ЗАЎСЁДЫ НАПЕРАДЗЕ

ПАВОЛІ гусцеу за вокнамі змрок. На небе ужо дзе-нідзе мільгацелі зоркі.

Пасля напружанага дня хлопцы салодка спалі. Раніцай іх паднялі па баявой трывозе. За кароткі час была прыведзена у баявую гатоунасць тэхніка, і яны адправіліся у зададзены раён.

Вечарам за прадэманстраванае высокае ваеннае майстэрства выдатніку баявой і палітычнай падрыхтоукі Аляксандру Грынкевічу аб'явілі падзяку...

Саша прыслухауся да гулу ветру. Восень ужо. Ліст пажоуклы ударацца аб шкло і паволі апускаецца на зямлю.

Вясною ён дэмабілізуецца і вернецца у Мінск, дзе працаваў і дзе марыць вучыцца. Шмат жыццёвых экзаменаў прыйшлося трымаць, і адзін з галоунейшых заутра — прыём у рады КПСС. Цэлы год Саша жыу гэтым заутрашнім днём. Здаецца, зусім нядауна прыйшоу ён пасля заканчэння дзесяцігодкі на Мінскі завод запасных частак. Стау працаваць вучнем токара. Цяжка было спачатку: і разцы ламаліся, і гарачая стружка апякала рукі, і брак атрымліваўся. Але хлопца падтрымалі сябры, майстры сваёй справы, і у хуткім часе, асвоіўшы сумежную прафесію слесара-наладчыка, ён стаў штодзённа перавыконваць норму, а потым і гадавы план. Надзвычай чулы да людзей, іх інтарэсаў і спраў, ён карыстауся аутарытэтам сярод камсамольцаў, і яны выбралі яго сваім важаком.

На адным з партыйных сходау яго рэкамендавалі для паступлення у рады КПСС ..

А потым, пасля армп. было падрыхтоучае аддзяленне юрыдычнага факультэта ВДУ імя У. І. Леніна, залічэнне студэнтам I курса. Адразу ж уключыуся у грамадскую работу: спачатку быу праформам, потым членам партбюро факультэта. Зараз сябры па вучобе аказалі яму вялікі давер — выбралі сакратаром камітэта камсамола факультэта. Шмат спрау і клопатаў у юнака, але галоўны свой абавязак — вучыцца — ён выконвае толькі на «выдатна». Быць наперадзе цяжка, бо на цябе рауняюцца астатнія студэнты і ў цябе павінна быць высокая маральная адказнасць за кожны свой учынак. Але хіба не гэта характарызуе тых, хто заўсёды наперадзе?

Я расказала аб адным з тых 160 камуністау, якія займаюцца на юрыдычным факультэце. Кожны шосты студэнт гэтага факультэта—член КПСС. Што ні чалавек, то свой характар, свой лёс, свае клопаты.

Канчаюцца заняткі. Спяшаюцца дадому дзяучаты, аб нечым разважліва гамоняць хлопцы. Закончыуся яшчэ адзін працоўны дзень. Але для многіх студэнтау ён яшчэ працягваецца.

Сёння на IV курсе камсамольскі сход, і камуністы ахвотна прысутнічаюць на ім, дапамагаюць камсамольцам вырашаць свае штодзённыя справы. Па ініцыятыве камуністау 4-я група у сувязі з абменам камсамольскіх дакументау звярнулася да усіх студэнтау універсітэта з заклікам «XXV з'езду КПСС—дастойную сустрэчу!» Група узяла на сябе павышаныя абавязацельствы. Асабісты прыклад паказваюць камуністы Гена Лісоускі, член бюро камітэта камсамола факультэта, Мікалай Корзун, член партыйнага бюро і іншыя. Зараз усе наманні студэнтау, у першую чаргу камуністау, накіраваны на выкананне узятых абавязацельстваў.

У камітэце камсамола я таксама застала групу юнакоу і дзяучат. Размова ішла аб абмене камсамольскіх дакумент а у. Лепш за усіх гэта мераприемства праведзена на II курсе, дзе запявалай з'яуляецца камуніст Ніна Ачапоуская, сакратар камсамольскага бюро курса.

Разам з тым суровы папрок таварышау пачулі тыя, хто не з поунай адказнасцю аднёсся да даручанай справы.

Камуністы заусёды тут, сярод камсамольцау. Камусьці патрэбен інтэрнат, у кагосьці непаладкі у сям'і, адстаючых трэба выклікаць на камсамольскае бюро.

Многія камуністы з'яуляюцца шэфамі у школах. Яны праводзяць вялікую работу сярод вучняу — чытаюць ім цыкл лекцый на прававыя тэмы. Многія з іх з'яуляюцца памочнікамі пракурора міліцыі, супрацоунікамі дзіцячых пакояу.

З першых дзён стараюцца камуністы падключыць да грамадскай работы камуністау-першакурснікау. У гэтым годзе іх прыйшло на факультэт 40. З тымі, партыйны стаж якіх менш за тры гады, кожны месяц праводзіцца партыйная вучоба. Перад імі выступаюць вопытныя работнікі партыі. Студэнты паутараюць Статут партыі, праграму. Шмат гаворыцца аб выхаваучай ролі камуністау у камсамольскіх арганізацыях, вядзецца вялікая падрыхтоука да паступлення кандыдатау у партыю, заслухоуваюцца справаздачы аб грамадскай рабоце камуністау. Добра зарэкамендавалі сябе Сяргей Губскі, камсорг групы, Наташа Буцава, намеснік па арганізацыйнай рабоце камітэта камсамола. Сакратаром партыйнай арганізацыі курса з'яуляецца студэнт II курса Толя Пятроу, выдатнік вучобы, член партыйнага камітэта універсітэта.

Камуністам заусёды трэба быць наперадзе: і у вучобе, і ў працы, і ў грамадскай дзейнасці, каб з гонарам апраудаць сваё высокае званне.

Л. ДРАЗДОВА,
студэнтка I курса журфака.

СТАРТУЕ БАСКЕТБОЛ

На кафедры фізічнага выхавання незвычайна ажыуленне. Чырвоныя сцягі, рознакаляровыя майкі спартсменаў, зацікауленыя твары балельшчыкаў настройваюць на бадзёры лад, клічуць у спартыуную залу, дзе адбываецца галоуная падзея дня. Тут праз некалькі хвілін адбудзецца адкрыццё першынства універсітэта па баскетболу у XXIV круглагадавой спартакіядзе.

Каманды - удзельніцы выстраіліся для урачыстага падняцця сцяга спаборніцтваў. Старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання В. В. Нікіцін дакладвае старшыні праўлення спортклуба універсітэта В. П. Шапяпевічу аб гатоўнасці каманд факультэтаў удзельнічаць у спаборніцтвах. Віктар Паулавіч віншуе спартсменаў з адкрыццём гульняў. Ганаровага права падняць сцяг спаборніцтваў удастоены прадстаўнікі каманд фізічнага (мужчыны) і геаграфічнага (жанчыны) факультэтаў, якія ў спартакіядзе мінулага навучальнага года заваявалі першыя месцы. Пад гукі Дзяржаўнага Гімна Савецкага Саюза Віктар Стэцык і Людміла Хілько ўзнімаюць сцяг спаборніцтваў. Старт першынству па баскетболу дадзены.

Мужчынская баскетбольная каманда фізічнага факультэта ужо 15 гадоу нязменны чэмпіён універсітэта. Ядро зборнай універсітэта — гэта таксама студэнты фізфака А. Малышаў, А. Кандрашын, В. Тоўсцік і іншыя. Жаночая каманда геаграфічнага факультэта мае хоць і меншы, але усё ж значны стаж чэмпіёнау. У мінулым навучальным годзе яны сёмы раз заваявалі першынство універсітэта сярод жаночых каманд. Другімі у мужчын і жанчын былі каманды факультэта прыкладной матэматыкі, а «бронзу» заваявалі мужчынская і жаночая каманды хімічнага факультэта.

— Баскетбол ва універсітэце — вельмі папулярны від спорту, — гаворыць галоўны суддзя спаборніцтваў, старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання Г. М. Грудо. — Ім займаюцца сотні студэнтаў. І сапрауды, дынамічнасць, імгненная рэакцыя спартсменаў зачароўвае, уладарна вядзе за сабой.

Мужчынская і жаночая каманды універсітэта — грозныя сапернікі многіх каманд рэспублікі. У летняй спартакіядзе вышэйшых навучальных установ БССР 1974—1975 навучальнага года наша мужчынская каманда заваявала трэцяе месца, жаночая паднялася на вышэйшую ступеньку п'едэстала. Чатырохкратныя уладальнікі кубка БССР, сямікратныя сярэбраныя прызёры першынства БССР — такія тытулы у жаночай зборнай. У розыгрышы кубка БССР 1974 і 1975 гадоу мужчынская зборная займала другія месцы. На працягу дзесяці апошніх гадоу баскетбалісты універсітэта — нязменныя прызёры СДСТ «Буравеснік». Вялікая заслуга у гэтым выкладчыкаў кафедры фізічнага выхавання О. Аніскевіч, А. Шукшына, трэнера В. Шхіньяна, ігракоў зборных каманд універсітэта Л. Буйніцкай, Л. Жабінскай, Л. Хілько, Н. Гузняк, Н. Анікінай, А. Малышава, А. Кажамякіна.

— За апошнія два-тры гады істотных змен у саставах каманд не адбылося, — адказвае на маё пытанне Г. М. Грудо.

Нашу размову перапыняе свісток суддзі. Закончылася першая сустрэча першынства універсітэта паміж жаночымі камандамі геаграфічнага і філалагічнага факультэтаў. З лікам 57:32 выйграли экс-чэмпіёны універсітэта. Спаборніцтвы працягваюцца.

П. ДАРАШЧОНАК,
студэнт II курса журфака, старшыня спортбюро факультэта.

П. З. САВАЧКІН

11 лістапада 1975 года на 65-м годзе жыцця пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр загадчык кафедры гісторыі СССР, дацэнт БДУ імя У. І. Леніна, член КПСС з 1944 года, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Пётр Захаравіч Савачкін.

П. З. Савачкін закончыў у 1931 годзе педвучылішча, працаваў настаунікам, а затым дырэктарам школы. У 1935 годзе ён пастуніў на гістарычны факультэт БДУ і з адзнакай закончыў яго у 1940 годзе.

З першых жа дзён Вялікай Айчыннай вайны П. З. Савачкін знаходзіўся на фронце, прайшоу баявы шлях ад Сталінграда да Берліна, удзельнічаў у вызваленні Беларусі.

У 1949 годзе ён закончыу аспірантуру, працаваў старшым выкладчыкам, затым дацэнтам кафедры гісторыі СССР, а у 1959 годзе узначаліу кафедру гісторыі СССР. З 1956 па 1973 год П. З. Савачкін працаваў дэканам гістарычнага факультэта. Выдатныя арганізатарскія здольнасці, партыйная прынцыповасць, непрымірымасць да недахопаў, добрае веданне усіх праблем вучэбнага працэсу стварылі яму вялікі аутарытэт сярод гісторыкаў і ў калектыве універсітэта.

П. З. Савачкіну належыць рад даследаванняў па гісторыі Беларускай ССР, вучэбных і метадычных дапаможнікаў. Ён з'яуляуся адным з рэдактараў шматтомнай гісторыі БССР, намеснікам галоунага рэдактара «Весніка БДУ імя У. І. Леніна».

Радзіма высока ацаніла баявыя, педагагічныя і навуковыя заслугі П. З. Савачкіна, узнагародзіушы яго ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, Чырвонай Зоркі і многімі іншымі урадавымі узнагародамі.

Сціплы і добрасумленны працаунік, добры таварыш, прынцыповы камуніст — такім назаусёды застанецца Пётр Захаравіч Савачкін у сэрцах усіх, хто яго ведау.

Група таварышаў.

ЦЁПАЫЯ ЖЫТОМІРСКІЯ СКАЛЫ

ЕСЦЬ каля горада Жытоміра здзіуляючае месца: лясныя паляны заканчваюцца каля ракі Цецерау крутым скальным абрывам, вышыня якога 25—30 метрау.

У Беларусі няма скал, якія можна было б выкарыстаць для трэніровак і спаборніцтваў, і таму альпіністау з Мінска, Гомеля, Брэста часта можна сустрэць тут, ля скальнага берага ракі Цецерау.

6 лістапада каманды скалалазау з Гомеля, Брэста, мінскіх ВНУ—БПІ, МРТІ, БДУ сабраліся тут, каб зноу паспрабаваць свае сілы у трохдзённых спаборніцтвах. Клуб турыстау-альпіністау нашага універсітэта паслау на гэтыя спаборніцтвы дзве каманды.

Раніца 7 лістапада. Уздоўж скальнага масіву павольна рухаецца уверх белаблакітны флаг студэнцкага рэспубліканскага спартыунага таварыства «Буравеснік». Асабіста-камандная першынство па спартыунаму скалалазанню пачалося.

Першая частка праграмы — індывідуальнае лазанне мужчын. Кожны удзельнік павінен прайсці прапанаваны маршрут хутка і без штрафных балау. На мужчынскім маршруце нашы рабяты занялі усе тры прызавыя месцы: I — М. Яуменчыкау, II—А. Ачасау, III — С. Ярхоу. Усе яны выканалі нормы першага спартыунага разраду па скалалазанню. У жанчын у індывідуальным скалалазанні I месца заняла Т. Баран з МРТІ, а II і III месцы заваявалі нашы дзяучаты І. Язерская і І. Варашылава. А маршрут быу не з лёгкіх. Дастаткова сказаць, што з 19 удзельніц прапанаваную дыстанцыю змаглі прайсці толькі сем.

Другі дзень спаборніцтваў — спаборніцтвы звязак — найбольш цікавая частка праграмы. Звязка у саставе двух спартсменаў павінна як мага хутчэй прайсці зададзены маршрут і спусціцца (у жанчын). Мужчынам жа трэба за 15 мінут па прапанаванаму маршруту узняцца як мага вышэй.

Хутка і тэхнічна праходзіць маршрут нашa звязка у саставе А. Савельевай і І. Варашылавай. Яны займаюць першае месца. Другое месца таксама у прадстаўніц БДУ — Л. Шыханцовай і Л. Бяляевай.

Ужо увечары закончыліся спаборніцтвы звязак сярод мужчын. Тут прымяняуся вялікі арсенал альпінісцкай тэхнікі: крукі, клiны, лесвічкі і інш. Першае месца заняла звязка з БДУ у саставе М. Яуменчыкава і У. Сіроціна, якія змаглі за 15 мінут узняцца на вышыню 10 метрау. Другое месца у гамяльчан, а трэцяе падзялілі В. Ціханенка і В. Машчэнка са звязкай з МРТІ.

Пасля двух дзён спаборніцтваў месцы каманд размеркаваліся наступным чынам: на першым — каманда БДУ-1, на другім — каманда МРТІ, на трэцім — зноу нашы скалалазы—каманда БДУ-2.

Апошні дзень спаборніцтваў — парныя гонкі. У гэтым відзе два спартсмены ідуць па паралельных маршрутах, а затым мяняюцца маршрутамі. У мужчын першае месца заняу спартсмен з МРТІ А. Мошнікаў, другое—гамяльчанін О. Саламыкін і толькі трэцяе месца ва Уладзіміра Сіроціна, супрацоуніка БДУ. Нашы спартсменкі А. Савельева і І. Варашылава занялі другое і трэцяе месцы, яны не змаглі апярэдзіць толькі Т. Баран з МРТІ.

Трэці дзень спаборніцтваў не змяніу парадку каманд у зводным пратаколе. Па-ранейшаму першае і трэцяе месцы засталіся у каманд БДУ, другое—у студэнтаў МРТІ.

М. ЯЎМЕНЧЫКАЎ.
Фота І. Варашылавай.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Рэдактар
Аб'ём—1,5, друк. ар. АТ 05559 Заказ № 1690. А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.